## Тэлесеткі



### Трэба штосьці мяняць

**Зрабіць гэта запрасілі сваіх глядачак вядучыя праграмы «Дзень у вялікім горадзе» на тэлеканале «Беларусь 1». Тут поўным ходам ідзе прыём заявак на ўдзел у новым праекце «да/ПАСЛЯ».**

Паводле яго ўмоў, каманда прафесіяналаў — візажыстаў, стылістаў і парыкмахераў — абавязваецца стварыць для некалькіх жыхарак вялікага горада розныя вобразы. А каб трапіць у шэрагі ўдзельніц эксперымента, глядачкам ва ўзросце 25 і больш гадоў неабходна падпісацца на акаўнты праграмы «Дзень у вялікім горадзе» ў сацсетках або даслаць заяўку на паштовы адрас: 220014, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9 з пазнакай «Дзень у вялікім горадзе». У лісце трэба расказаць пра сябе і адказаць на пытанне, чаму ўдзел у праекце важны асабіста для вас, і дадаткова прыкласці некалькі фотаздымкаў. Параўнальныя вынікі «да» і «пасля» будуць прадстаўленыя ў хуткім часе ў прамых эфірах праекта.

### З дэкрэтнага водпуску

**Пасля трохмесячнай паўзы ўжо з 6 лютага вяртаецца ў эфір «Добрай раніцы, Беларусь!» на «Беларусь 1» сямейны дуэт вядучых Тэа і Вольгі Рыжыкавай. Маладыя бацькі (іх Валеры хутка споўніцца два месяцы) хоць і ўжыліся ў прыемную ролю дома, але не змаглі доўга выседзець без любімай прафесіі і тэлээфіраў.**



«Дзякуючы Валеры ў мяне і ў Тэа з'явілася жаданне станавіцца лепш і рухацца толькі наперад, каб надалей наша дачка магла ганарыцца бацькамі. Таму мы з вялікай радасцю вяртаемся ў эфір і дзякуем за падтрымку і разуменне нашым калегам і кіраўніцтву канала», — гаворыць Вольга Рыжыкава, жартуючы, што цяпер гадзін у сутках стала больш, а раннія пад'ёмы наогул не праблема, бо дачка прывучыла хутка прачынацца ў любы час. Да таго ж на дапамогу сям'і прыйшлі бабулі і дзядулі, якія з задавальненнем нясуць «вахту» каля ўнучкі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА. Фота прэс-службы БТРК.**

## ШАШКІ

**(«Звязда») Выпуск № 81**

У пачатку студзеня ў дні школьных канікул у сталіцы Латвіі Рызе адбыўся XXXVIII міжнародны юнацкі камандны турнір па шашках-100 «Залатая шашка», у якім прынялі ўдзел 20 каманд з пяці краін, у тым ліку пяць беларускіх з Гомеля, Мар'інай Горкі і Мінска.

Мінская каманда РЦАП-1 (Захар Шыбакоў, Сцяпан Дарашэнка, Вікторыя Нікалаева, Паліна Казлова) выйграла турнір з класічным кантролем і турнір па бліскавічнай гульні. На трэцім месцы — дзявочая каманда РЦАП-2 (Марыя Часнакова, Дар'я Нікіфарава, Марына Наўроцкая, Яўгенія Швед).

Паглядзіце цікавую партыю паміж маладымі майстрамі В. Разаевым і О. Чапай, якая гулялася на чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па шашках-64 (1 ліга).

1.e3-d4 h6-g5 2.g3-h4 g7-h6 3.d4-c5 b6xd4 4.c3xg7 h8xf6 5.h2-g3 d6-e5 6.b2-c3 c7-d6 7.a3-b4 ? Далей чорныя з дапамогай тактычнага прыёму выйграюць шашку або пранікаюць у дамкі. Паспрабуйце знайсці шлях да перамогі самастойна.

**№ 6**



Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя Ю. Мурадавым *(Барысаў)* у шашкі-64 і вядучым аддзела ў шашкі-100.

**№ 7**

**Белыя простыя шашкі:** a5, b6, c3, c7, d2, e1, g3, h2 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** b4, b8, d6, d8, e5, f6, g5, g7, h8 (9).

**№ 8**

**Белыя простыя шашкі:** 16, 24, 30, 31, 33, 34, 39, 42, 49, 50 (10).

**Чорныя простыя шашкі:** 8, 12, 13, 14, 17, 18, 22, 25, 26, 32 (10).

**№ 9**

**Белыя простыя шашкі:** 23, 32, 34, 35, белыя дамкі: 15 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** 11, 21, 25, чорныя дамкі: 36 (4).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 80 ад 16.01.19.

№ 3 ef4, cd6, b8, b4 (c3) h8 (ab2,d2) c3, c5 +

№ 4 ef4, cd6, b8, a3 (d4) b4, e1+

№ 5 g5, b8, f8 +

**Правільныя адказы даслалі:** В. Дударэвіч *(в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на)*, Ф. Карпей *(Мядзел)*, У. Статкевіч *(п. Зялены Бор, Івацэвіцкі р-н)*, У. Панько *(Камянец)*, І. Ананіч *(Гродна)*, А. Шурпін *(Івянец)*, В. Ваўчкоў *(Маладзечна)*, П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў, С. Рашэцін *(усе — Мінск)*, В. Таўкачоў *(Клімавіцкі р-н)*, В. Бандарык *(Мінскі р-н)*.

*Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# Тры нагоды ўключыць тэлевізар

### ЭКСКУРСІЯ

Кожную нядзелю сацыякультурны канал «Беларусь 3» расказвае «Арт-гісторыі» ў цыкле праграм, прысвечаным 80-годдзю Нацыянальнага мастацкага музея. З першых вуснаў — ад навуковых супрацоўнікаў музея — гледачы могуць даведацца пра самыя розныя калекцыі, ад старажытнага іканапісу да рэдкіх і ўнікальных узораў рускага, еўрапейскага і ўсходняга мастацтва XIX—XX стагоддзяў, і пра тое, які след у свеце пакінуў той ці іншы мастацкі твор. Напрыклад, даследчык старажытнабеларускага мастацтва Дзмітрый Салодкі расказаў пра беларускія познасярэднявечныя іконы на




прыкладзе некалькіх абразоў Маці Божай Адзігітрыі і навучыў «счытваць» з іх пэўныя сакральныя коды. Іншымі «Арт-гісторыямі» падзеляцца знаўца рускага і беларускага мастацтва XIX—XX стагоддзяў Надзея Усава, спецыяліст па ўсходняй мастацкай культуры Мікіта Моніч, мастацтвазнаўца Наталля Сяліцкая і загадчыца аддзела сучаснага беларускага мастацтва Кацярына Ізафатава.

Дарэчы, усе гэтыя гісторыі можна не толькі ўбачыць, але і паслухаць у падкастах — аўдыяверсіях праграмы, якія будуць змяшчацца на сайце тэлеканала www.3 belarus.by па аўторках.

### ДАТА

8 лютага адзначыць 70-годдзе вядомая актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расіі Ірына Мураўёва. Гледачы розных узростаў ведаюць і любяць яе па фільмах «Чыста англійскае забойства», «Карнавал», «Масква слязам не верыць», «Самая абаяльная і прывабная», «Артыстка з Грыбава», «Гэта жанчына ў акне» і многіх іншых, па серыяле «Не нарадзіся прыгожай», папулярнай у свой час дзіцячай тэлепраграме «Будзільнік», мультфільмах «Сабака ў ботах» і «Кошкін дом», па мностве рознахарактарных тэатральных пастановак... І мала хто з прыхільнікаў паверыць, што стаць прафесійнай актрысай Мураўёвай удалося далёка не адразу — з першай спробы ўсе тэатральныя інстытуты адмовілі ёй, а на другі год дзяўчына ледзьве паспела ўскочыць у апошні вагон і паступіла ў вучэбную студыю пры Цэнтральным дзіцячым тэатры, а пасля ўсё ж такі скончыла Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва. Час расставіў усё на свае месцы, і ад невялікіх эпізодаў актрыса лагічна перайшла да цэнтральных роляў, за якія яе, уласна, палюбілі гледачы, — у 1982-м часопіс «Савецкі экран» нават назваў Мураўёву найлепшай актрысай года, а крыху пазней «Самую абаяльную і прывабную» паглядзела звыш 80 мільёнаў чалавек! Больш за 40 гадоў актрыса пражыла з адным мужам — рэжысёрам Леанідам Эйдліным, і выхавала дваіх сыноў, прычым не ў тэатральным закуліссі ці на здымачнай пляцоўцы, а дома, з лёгкасцю адмаўляючыся ад заманлівых прапаноў, калі гаворка ішла пра сям'ю...



Уласна, што тут яшчэ дадаць. 9 лютага не прапусціце на АНТ меладраму «Самая абаяльная і прывабная», а таксама падрыхтаваны расійскімі тэлевізійнікамі да юбілею актрысы дакументальны фільм «Больш сонца, менш суму».

### АНЕКДОТ



Праект «Анекдот-шоу», рэалізаваны паводле добра забытага старога «Белага папугая» ўсюдысным і неўтаймоўным экс-гульцом КВЗ, рэзідэнтам «Камедзі Клаб», шоўменам, акцёрам і рэжысёрам Вадзімам Галыгіным, — гэта своеасаблівы гумарыстычны спарынг з удзелам запрошаных зорак — людзей тэатра і кіно, спартсменаў, палітыкаў, тэлеперсон і г. д. Пераможцу ў паядынку вызначае адмысловы «смехамер» — прылада, якая замярае гучнасць смеху гледачоў у зале. Пераможца атрымлівае асаблівы прыз — прэмію «Залатая рыдлёўка».

Што цікава, амаль год шоу выходзіла ў інтэрнэт-прасторы — у відэатрансляцыях сацыяльнай сеткі «Аднакласнікі» (прычым пілотны выпуск набраў больш як чатыры мільёны праглядаў!). Толькі ў канцы 2018-га праграма пераехала на расійскі канал Рэн-ТБ, а ўжо адтуль трапіла ў эфір СТБ і, адпаведна, на вочы зямлякам. Мяркуйце самі, наколькі гэта смешна або сумна — па нядзелях, у 23.30.



## Ветах — месяц... з камарову дзюбу

**Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевіктарына ўжо каторы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...**

**А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць удзел у віктарыне, могуць удасканальваць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам,**

**ці ведалі вы, што:**

**абба́рсаць** — неахайна абвязаць што-небудзь, аблытаць вяроўкай;

**ве́тах** — месяц у апошняй квадры, на зыходзе;

**по́шчак** — пералівісты дрыжачы гук; водгук, рэха;

**корт** — тоўстая баваўняная тканіна для рабочага і спартыўнага адзення;

**ко́зыт** — адчуванне лёгкага нервовага раздражнення, якое выклікаецца дотыкам да скуры;

**прытно́м** — непасрэдна адзін за адным; запар;

**лата́к** — адкрыты жолаб для сцёку, ссыпання чаго-небудзь;

**на́зіркам** — не спускаючы з вачэй;

**з камарову дзюбу** — пра што-небудзь надта малое, мізэрнае (беларускія сінонімы: з вераб'ёву душу, камарова жменя, з курачу галаву; рускі адпаведнік: с гулькин нос);

**вочы замыльваць** — уводзіць у зман, ашукваць каго-небудзь (беларусы яшчэ скажуць: вочы сляпіць (туманіць), жвір у вочы сыпаць, мазгі назад заврнуць; рускія: замазывать глаза).